# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча «Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)», прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя

Дысертацыйнае даследаванне Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча, палажэнні якога прадстаўлены ў аўтарэфераце, з'яўляецца значным укладам у вывучэнне гісторыі беларускага нацыянальнага руху і адукацыйных працэсаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Яно прысвечана малавывучанай, але выключна важнай тэме – дзейнасці беларускіх гімназій у заходнебеларускім рэгіёне ва ўмовах палітыкі паланізацыі. Праца прадстаўляе сабой сінтэз сацыяльна-культурнай, палітычнай і адукацыйнай гісторыі, што дазваляе разглядаць беларускія гімназіі не толькі як навучальныя ўстановы, але і як суб'екты нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

Навуковая навізна даследавання пацвярджаецца шэрагам ключавых момантаў. Па-першае, у айчыннай гістарыяграфіі беларускія гімназіі ўпершыню разглядаюцца як цэласная сетка інстытутаў, што функцыянавалі ва ўмовах замежнага панавання. Кірыл Дзмітрыевіч прапануе навуковую перыядызацыю іх дзейнасці, якая складаецца з чатырох этапаў. Па-другое, калектыўны партрэт педагагічнага корпусу і вучнёўскага складу беларускіх сярэдніх школ складзены на падставе біяграфічных і статыстычных дадзеных, што дазваляе ўбачыць сацыяльныя, канфесійныя і нацыяльныя характарыстыкі гімназічных супольнасцяў. Па-трэцяе, дысертант самастойна апрацаваў архіўныя матэрыялы, увёў у навуковы зварот новыя матэрыялы з архіваў і музеяў Беларусі і Літвы, у тым ліку эга-дакументы, паліцэйскія справаздачы, заканадаўчыя акты і статыстычныя звесткі. Па-чацвёртае, канцэптуальнае абгрунтаванне беларускіх гімназій як аднаго з цэнтраў нацыянальна-культурнага жыцця паказвае, як беларускі адукацыйны працэс стаў адным з сродкаў захавання мовы, культуры і гістарычнай памяці ў

міжваеннай Заходняй Беларусі ва ўмовах асіміляцыйных працэсаў з боку польскай дзяржавы.

Аўтарэферат дысертацыіі Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча не мае значных недахопаў. Аўтар паспяхова вылучыў ключавыя аспекты даследавання – ад перыядызацыі дзейнасці да ролі педагогаў і вучняў у захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці. Усё гэта ў дакладнай і сціслай форме было ўключаны ў аўтарэферат, што з'яўляецца якасным, поўным і лагічным абагульненнем даследавання.

Дысертацыя «Беларускія гімназіі ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)» Ананькі Кірыла Дзмітрыевіча з'яўляецца арыгінальнай, самастойнай і завершанай навуковай працы, якая прадстаўляе значны ўклад у вывучэнне айчыннай гісторыі. Яна адпавядае патрабаванням ВАК для абароны навуковых прац, а яе аўтар заслугоўвае ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя.

Дэкан гуманітарнагафакультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта
імя Еўфрасінні Полацкай,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт А. Л. Радзюк

Подпись Радюка удостоверяю
Специалист по кадрам